ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 1 (1075) ● Чацвер, 9 студзеня 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС ЗВЯРТАЕЦЦА ДА ВАС, ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ САВЕЦКАЙ КРАІНЫ:

БУДЗЬЦЕ ДАСТОЙНАЙ ЗМЕНАЙ СТАРЭЙШЫХ ПАКАЛЕННЯЎ, ПРАДАЎЖАЛЬНІКАМІ ІХ ГЕРАІЧНЫХ СПРАЎ І ТРАДЫЦЫЙ. НАСТОЙЛІВА І ЎПОРНА АВАЛОДВАЙЦЕ ВЕДАМІ, АЗНАМЯНУЙЦЕ ЗАВЯРШАЛЬНЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ ЎДАРНАЙ ПРАЦАЙ; УНОСЬЦЕ ДАСТОЙНЫ ЎКЛАД ВА УСЕНАРОДНУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ПАСПЯХОВАЕ ВЫКАНАННЕ ПЛАНАЎ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ!

*(Са Звароту Цэнтральнага Камітэта КПСС да партыі, да савецкага народа).*

**Камсамольскае жыццё**

## КАМІТЭТ КАМСАМОЛА — ШТАБ «КП»

Штаб «Камсамольскага пражэктара» БДУ удзяляе вялікую ўвагу аналізу работы факультэцкіх штабаў «КП», абагульненню іх вопыту, папулярызацыі лепшых пачынанняў «пражэктарыстаў». Гэтым пытанням былі прысвечаны чатыры пасяджэнні штаба у мінулым навучальным годзе і адно пасяджэнне у сёлетнім.

Разглядаючы матэрыялы пасяджэнняў, аналізуючы работу «КП» факультэтаў за гэты перыяд, можна адзначыць, што найбольш плённа штабы «Камсамольскага пражэктара» працуюць у другой палавіне навучальнага года. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што пасля выбрання на справаздачна-выбарных камсамольскіх канферэнцыях штабаў «КП» каля месяца ідзе на правядзенне арганізацыйных мерапрыемстваў — размеркаванне абавязкаў, арганізацыю вучобы актыву, знаёмства са спецыфікай работы і г. д.

Чаму такі доўгі перыяд штабы «КП» працуюць недастаткова эфектыўна? Адказ тут можа быць толькі адзін. Камітэты камсамола дапускаюць вялікую змяняльнасць членаў штабаў «Камсамольскага пражэктара» і, у першую чаргу, старшынь. Так, у гэтым годзе 10 з 12 старшынь штабаў «КП» былі перавыбраны. Гэта, у сваю чаргу, прывяло да таго, што на працягу кастрычніка-лістапада 1974 года большасць штабаў займалася падборам актыву «пражэктарыстаў», знаёмствам з формамі і метадамі работы у ВНУ і г. д. Вынік? На некаторых факультэтах у першым семестры ўся работа «Камсамольскага пражэктара» звялася да выпуску аднаго — двух нумароў «КП».

У гэтым навучальным годзе старшынямі многіх штабаў «КП» былі выбраны першакурснікі — А. Кішкевіч (гістфак), А. Зэльдзін (журфак) і інш. Гэта камуністы, якія знаёмы з камсамольскай работай і, у прыватнасці, з работай «КП». Першыя месяцы, якія прайшлі пасля выбрання іх старшынямі штабаў, паказваюць, што гэтыя таварышы у асноўным паспяхова спраўляюцца са сваімі абавязкамі. Так што практыка выбрання кіраўнікамі штабаў «КП» студэнтаў-камуністаў з першых-другіх курсаў, на наш погляд, апраўдвае сябе. Накапіўшы пэўны вопыт, яны паспяхова змогуць працаваць на працягу некалькіх гадоў.

Мабыць, камітэтам камсамола факультэтаў неабходна надалей не дапускаць неапраўданай змяняльнасці актыву «Камсамольскага пражэктара». Гэта, несумненна, павысіць якасць яго работы.

Камітэты камсамола павінны удзяляць самую сур'ёзную увагу бягучай рабоце штабаў «КП». Неабходна даць канкрэтныя надзённыя заданні у адпаведнасці са спецыфікай кожнага факультэта, пракантраляваць іх выкананне, прааналізаваць рэзультатыўнасць гэтай работы.

Штаб «КП» універсітэта плануе і праводзіць, як правіла, мерапрыемствы агульнаўніверсітэцкага маштабу.

Хацелася, каб камітэты камсамола факультэтаў на сваіх пасяджэннях з удзелам прадстаўнікоў штаба «КП» універсітэта, факультэцкіх груп народнага кантролю заслухалі справаздачы штабаў «Камсамольскага пражэктара» аб рабоце, якую яны зрабілі. Гэта павысіць адказнасць «пражэктарыстаў» за справы камсамольскай арганізацыі, дазволіць ліквідаваць некаторую адарванасць штабаў «КП» ад камітэтаў камсамола, актывізуе работу «Камсамольскага пражэктара».

**П. БРЫГАДЗІН,**
**старшыня штаба «КП» універсітэта.**

## ЗАВЯРШЫЛІ ПАСПЯХОВА

**На ўсіх факультэтах БДУ напярэдадні Навагодняга свята падведзены вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў 1974 года. Яны характарызуюцца бачнымі дасягненнямі і поспехамі ў вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай, палітыка-выхаваўчай, шэфскай рабоце.**

**Калектыў фізічнага факультэта, напрыклад, падрыхтаваў да друку больш за 30 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, сем манаграфій, 392 навуковыя артыкулы, зроблена 38 заявак на вынаходніцтвы, восем прадстаўнікоў факультэта выступілі на міжнародных і 166 — на усесаюзных і рэспубліканскіх канферэнцыях.**

**На ВДНГ СССР дэманстраваўся паўправадніковы квантавы генератар, распрацаваны на кафедры электрафізікі. Экспанат удастоен сярэбранага медаля, і цяпер з ім знаёмяцца наведвальнікі выстаўкі «Дасягненні савецкай навукі і тэхнікі», якая адкрылася ў Балгарыі.**

**Аб'ём гаспадарча-дагаворных работ фізфака, у якіх удзельнічаюць 316 студэнтаў, склаў 1585 тыс. рублёў.**

**Паспяхова завяршылі 1974 год і іншыя факультэты БДУ.**

**Наш. кар.**

## ПЛЁН ДАСЛЕДЧАЙ ПРАЦЫ

СТУДЭНТ І НАВУКА

Рэалізуючы задачы павышэння ідэйна-тэарэтычнага узроўню выкладання грамадскіх навук і рашэнні XXIV з'езда КПСС, кафедра палітычнай эканоміі прыродазнаўчых факультэтаў намеціла у гэтым навучальным годзе правесці навукова-тэарэтычныя канферэнцыі на ўсіх курсах, дзе чытаецца палітычная эканомія.

На факультэце прыкладной матэматыкі, напрыклад, на працягу двух дзён студэнты IV курса абмяркоўвалі актуальныя пытанні «Эканамічныя заканамернасці развіцця сусветнай сістэмы сацыялізму» і «Стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму».

На канферэнцыі было заслухана 32 даклады. З вялікай цікавасцю быў сустрэт даклад Н. Літвінавай, прысвечаны матэрыяльнаму і маральнаму стымуляванню у працэсе перарастання сацыялістычнай працы у камуністычную. Даклад утрымліваў канкрэтны матэрыял, які быў сабраны на адным з мінскіх прадпрыемстваў. Знаёмячыся з вытворчасцю, студэнтка склала табліцы, выкарыстала метад анкетавання пры выяўленні ролі матэрыяльнага і маральнага стымулявання працы.

Трэба адзначыць даклад студэнта Ф. Буша (ГДР) «Месца і роля ГДР у сацыялістычнай эканамічнай інтэграцыі». Разглядзеўшы асноўныя напрамкі эканамічнага і навуковага супрацоўніцтва сацыялістычных краін, дакладчык на шырокім статыстычным матэрыяле паказаў развіццё эканамічнага і навуковага супрацоўніцтва паміж СССР і ГДР, адзначыў значэнне інтэграцыі паміж краінамі СЭУ для далейшага умацавання і развіцця сацыялізму.

Цікавае паведамленне аб навуковай арганізацыі працы у станкабудаванні зрабіла Т. Піваваронак.

Ленінскім прынцыпам сацыялістычнага гаспадарання, іх творчаму развіццю і увасабленню у жыццё на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва былі прысвечаны выступленні Л. Дзімітровай, М. Івановай, А. Енчавай (НРБ). Яны расказалі аб дасягненнях Народнай Рэспублікі Балгарыі за 30 год сацыялістычнага развіцця, прывялі красамоўныя лічбы і факты.

Аналізу праблем навукова-тэхнічнай рэвалюцыі прысвяцілі свае выступленні С. Кардаш і В. Юрык.

Багаты матэрыял утрымлівае і даклад Л. Чэрнік «Поспехі сусветнай сістэмы сацыялізму у эканамічным спаборніцтве з капіталізмам».

У заключэнне выступіў прафесар І. Д. Прахарэнка. Ён адзначыў узрослую грамадска-палітычную актыўнасць студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі, іх імкненне глыбока і творча авалодваць марксісцка-ленінскай тэорыяй, сур'ёзны падыход да праблем сацыялістычнай вытворчасці, умацавання эканамічнай і палітычнай магутнасці нашай Радзімы.

Практыка правядзення студэнцкіх навукова-тэарэтычных канферэнцый паказала, што яны з'яўляюцца важнейшым сродкам прыцягнення студэнтаў да больш актыўнага удзелу у грамадскім і навуковым жыцці ВНУ.

**К. ХАРАШУН,**
**выкладчык кафедры палітычнай эканоміі прыродазнаўчых факультэтаў.**

*Сесія пачалася. Апусцелі аўдыторыі; толькі па-ранейшаму звіняць званкі і усё яшчэ вісіць без змен расклад заняткаў.*

*Асноўнае месца знаходжання студэнта сёння—бібліятэка і кабінет. Трэба прагледзець дапаможнікі, дапоўніць з падручніка запісы ў канспекце, запоўніць усе прагалы і «белыя плямы». Менавіта такая атмасфера пануе у чытальнай зале юрыдычнага корпуса.*

*Калі ж да экзамена застаюцца лічаныя дні, вельмі дарэчы кваліфікаваная кансультацыя выкладчыка. Са студэнтамі IV курса юрфака яе праводзіць дацэнт А. А. Рамановіч. Абмяркоўваецца жыллёвае права.*

Фота *С. Дзеянкова.*







## НАВІНЫ

Студэнты I курса факультэта журналістыкі наведалі літаратурны музей Якуба Коласа.

Многа цікавых падрабязнасцей з жыцця народнага паэта паведаміў будучым журналістам выкладчык, доктар філалагічных навук С. Х. Александровіч, знаёмячы іх з экспазіцыяй музея. Усё тут засталося такім, як і пры жыцці паэта.

Ужо зараз у музеі ідзе падрыхтоўчая работа да юбілею — 100-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа. На месцы цяперашняга музея будзе створан мемарыяльны комплекс, рыхтуецца выданне твораў паэта на рускай мове.

**Е. ЖАБО.**

***

**«Гнасеалагічныя праблемы тэорыі паводзін чалавека і жывёл» — тэма заняткаў, якія адбыліся ў панядзелак, філасофскага семінара прафесарска-выкладчыцкага саставу біялагічнага факультэта. З дакладам выступілі дацэнты Б. Ф. Осіпаў, К. І. Грышан, А. І. Сташонак, Г. І. Захарэўская.**

***

У бібліятэцы галоўнага корпуса прыцягваюць увагу тэматычныя выстаўкі. Яны прысвечаны пэўным падзеям, юбілейным датам. Гэта — «Рэспубліка Куба», «Акіян сілы» (да дня энергетыка), «Газета «Уперад» (да 70-годдзя з дня выхаду першага нумара). Кнігі і артыкулы з часопісаў на выстаўцы «Машына прымае экзамен» дапамагаюць чытачу разабрацца ў прынцыпах выкарыстання ЭВМ у вучэбным працэсе.

***

**На гістфаку з'явілася не зусім звычайная аб'ява: «Упершыню ў гісторыі студэнцкага будаўнічага руху арганізуецца зімовы СБА у складзе 15 байцоў. Запрашаюцца ўмелыя, вынослівыя». Мяркуецца, што атрад будзе працаваць усе зімовыя канікулы.**

Бюро ЦК ЛКСМ Беларусі, калегія Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, калегія Міністэрства асветы БССР, калегія Міністэрства аховы здароўя БССР, Прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў прынялі сумесную пастанову аб правядзенні штогадовага рэспубліканскага агляду-конкурсу на лепшую акадэмічную групу вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Ён абумоўлен задачай паспяховага ажыццяўлення пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканальванню вышэйшай адукацыі ў краіне», пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце ў Маскоўскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы імя М. Э. Баумана і Саратаўскім дзяржаўным універсітэце імя М. Г. Чарнышэўскага па павышэнню ідэйна - тэарэтычнага ўзроўню выкладання грамадскіх навук», задач, выкладзеных Генеральным сакратаром ЦК КПСС таварышам Л. І. Брэжневым на Усесаюзным злёце студэнтаў па далейшаму паляпшэнню падрыхтоўкі кадраў спецыялістаў.

Агляд-конкурс на лепшую акадэмічную групу праводзіцца ў тры туры.

Першы тур праходзіць у ВНУ з 1 верасня па 30 жніўня наступнага года.

Другі тур праводзіцца ў абласцях з 10 па 15 верасня.

Трэці тур праводзіцца ў Мінску з 15 па 20 верасня.

# УМОВЫ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

Лепшая акадэмічная група факультэтаў вызначаецца па наступных асноўных паказчыках:

**1. Паспяховасць студэнтаў.**

А) Колькасны паказчык у цэлым па ўсіх дысцыплінах вызначаецца сярэдняй па дзвюх сесіях абсалютнай (лічнік) і якаснай (назоўнік) паспяховасцю, выражанай у працэнтах, справаздачнага навучальнага года (без перaздач у дадатковую сесію).

**ЗАЎВАГА:**

1) абсалютная паспяховасць студэнтаў вызначаецца адносінай колькасці студэнтаў, здаўшых сесію, да агульнай колькасці студэнтаў, якія павінны былі здаваць сесію;

2) якасная паспяховасць вызначаецца адносінай колькасці студэнтаў, здаўшых усе экзамены на «добра» і «выдатна», да ліку студэнтаў, здаўшых у сесію;

3) разлік па сесіях вядзецца паасобна ў сувязі з тым, што колькасць студэнтаў групы ў асеннім і вясеннім семестрах можа быць рознай. Пры разліку паказчыкаў зімовай сесіі кантынгент бярэцца па стану на 1 студзеня, вясенняй — на 1 чэрвеня справаздачнага года. Канчатковыя значэнні абсалютнай і якаснай паспяховасці прымаюцца як сярэднія значэнні па дзвюх сесіях.

Б) Па грамадскіх навуках патрабаванні аналагічныя, як і па п. 1А.

**2. Удзел студэнтаў у навуковай рабоце.**

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай кантынгенту студэнтаў акадэмічнай групы, удзельнічаючых у справаздачным навучальным годзе ў выкананні гаспадарча-дагаворнай навуковай тэматыкі кафедры і СКБ, да ліку студэнтаў у групе.

**ЗАЎВАГА:**

1) удзельнічаючымі ў навуковай рабоце лічацца студэнты, выконваючыя канкрэтнае заданне па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы, якое выдадзена навуковым работнікам кафедры і мела характар самастойнай даследчай, праектна-разліковай і т. п. работы, і адпрацаваўшыя на працягу справаздачнага года не менш трох месяцаў. Да справаздачнай формы прыкладваецца спіс, засведчаны кафедрай, СКБ, кіраўніком гуртка;

2) калі маюцца дакументы, пацвярджаючыя ўдзел студэнтаў у дзяржбюджэтнай навукова-даследчай рабоце, напрыклад, справаздача ці артыкул, сааўтарамі якіх з'яўляюцца студэнты, дык яны таксама лічацца ўдзельнічаючымі ў НДР;

3) на I—III курсах да ліку студэнтаў, што займаюцца навуковай работай, трэба адносіць такіх, якія рэгулярна ўдзельнічаюць у рабоце навуковых гурткоў, у падрыхтоўцы і правядзенні навуковых алімпіяд, конкурсаў.

**3. Якасць навуковых работ студэнтаў.**

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці студэнцкіх работ, адзначаных у справаздачным годзе на ўніверсітэцкіх, рэспубліканскіх, саюзных выстаўках, аглядах і конкурсах медалямі, граматамі, прэміямі і дыпломамі, да агульнай колькасці студэнтаў у гэтай групе.

**4. Удзел студэнтаў у конкурсе работ па грамадскіх навуках.**

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, пададзеных на кафедры сацыяльна-эканамічных навук, да ліку студэнтаў у групе.

**5. Якасць навуковых работ па грамадскіх навуках.**

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці работ па грамадскіх навуках, адзначаных у справаздачным годзе на ўніверсітэцкім, рэспубліканскім і ўсесаюзным аглядах-конкурсах, да ліку студэнтаў у групе.

**6. Атэстацыя па грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў.**

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці атэставаных студэнтаў да кантынгенту студэнтаў у данай групе.

**ЗАЎВАГА.** Колькасць студэнтаў бярэцца па стану на 1 чэрвеня.

**7. Удзел студэнтаў у грамадскім жыцці.**

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці студэнтаў групы, маючых пастаянныя грамадскія даручэнні ў справаздачным годзе, да ліку студэнтаў.

**ЗАЎВАГА.** Да пастаянных грамадскіх даручэнняў адносіцца непасрэдны ўдзел у рабоце партбюро, прафбюро, бюро ЛКСМБ, студэнцкім савеце, у розных пастаянна дзейнічаючых камісіях, групе народнага кантролю і т. п., работа ў трохвугольніку групы, студэнцкае куратарства, пастаянная работа ў ДНД і г. д.

**8. Трэці працоўны семестр.**

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці студэнтаў, працуючых у справаздачным годзе ў будаўнічых атрадах, на цаліне, у калгасах і саўгасах, у брыгадах універсітэта, да ліку студэнтаў у групе.

**9. Заняткі фізкультурай і спортам.**

А) У цэлым.

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці студэнтаў акадэмічнай групы — значкістаў ГПА — да ліку студэнтаў у групе, за выключэннем вызваленых ад здачы норм медкамісіяй. Звесткі пацвярджае кафедра фізвыхавання.

Б) Спартсмены-разраднікі.

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці падрыхтаваных у справаздачным годзе з ліку студэнтаў акадэмічнай групы спартсменаў-разраднікаў да кантынгенту групы, за выключэннем вызваленых ад заняткаў фізкультурай.

**ЗАЎВАГА.** Да справаздачнай формы прыкладваецца спіс, засведчаны кафедрай фізвыхавання.

В) Спартсмены-прызёры.

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці прызавых месц, занятых у справаздачным годзе студэнтамі групы на ўніверсітэцкіх, занальных, рэспубліканскіх, усесаюзных і т. п. спаборніцтвах, да ліку студэнтаў групы, за выключэннем вызваленых ад заняткаў фізкультурай па медыцынскіх даных. Звесткі пацвярджаюцца кафедрай фізвыхавання.

**10. Узровень дысцыпліны.**

Колькасны паказчык вызначаецца адносінай колькасці дапушчаных у справаздачным годзе парушэнняў дысцыпліны студэнтамі групы да ліку яе студэнтаў.

**ЗАЎВАГА.** Зыходныя даныя аб парушэнні дысцыпліны бяруцца за год: з пачатку навучальнага года на 1 верасня наступнага года. Колькасць парушэнняў лічыцца па спагнаннях, вынесеных студэнтам распараджэннем дэкана па факультэту, рэктара па ўніверсітэту і загадам рэктара.

# ТЭРМІНЫ ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ І МЕРЫ ЗААХВОЧВАННЯ

**1. Падвядзенне вынікаў агляду-конкурсу на лепшую акадэмічную групу праводзіцца ў наступныя тэрміны:**

— вынікі I тура падводзяцца ў ВНУ з 1 па 10 верасня;

— вынікі II тура падводзяцца ў вобласці з 10 па 15 верасня;

— вынікі заключнага тура падводзяцца ў Мінску з 15 па 20 верасня і друкуюцца ў газетах да Дня нараджэння камсамола Беларусі — 24 верасня.

2. Для арганізацыі агляду-конкурсу і падвядзення вынікаў ствараюцца пастаянныя аглядавыя камісіі, у якія ўваходзяць прадстаўнікі рэктарата, парткома, камітэта камсамола, мясцовага і прафсаюзнага камітэтаў, старасты груп, выдатнікі вучобы, камсамольскія і прафсаюзныя актывісты, выкладчыкі. Састаў камісіі зацвярджаецца рэктарам.

3. Пры падвядзенні вынікаў I тура аглядавая камісія вызначае лепшыя акадэмічныя групы кожнага курса, факультэта, ВНУ. Яны адзначаюцца загадам па факультэту, універсітэту, узнагароджваюцца граматамі, заносяцца на Дошку гонару. Для пераможцаў арганізоўваюцца экскурсіі па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа.

Куратары груп, заняўшых першае, другое і трэцяе месцы (па ўсіх курсах) ва ўніверсітэце, заахвочваюцца рэктарам па прадстаўленню дэканата і грамадскіх арганізацый факультэтаў.

4. Тры лепшыя акадэмічныя групы ўніверсітэта прадстаўляюцца на II тур агляду-конкурсу. Пераможцы II тура ўзнагароджваюцца пераходнымі вымпеламі, граматамі абкома камсамола, атрымліваюць права на арганізаваны адпачынак на льготных умовах у перыяд зімовых або летніх канікулаў і паездкі па гістарычных месцах рэспублікі.

5. Пераможцы III тура агляду-конкурсу ўзнагароджваюцца пераходнымі вымпеламі, дыпломамі органаў — заснавальнікаў конкурсу, атрымліваюць права на арганізаваны адпачынак на льготных умовах у перыяд зімовых або летніх канікулаў, заносяцца ў Кнігу гонару ЦК ЛКСМБ.



Практычныя і тэарэтычныя веды, якія набываюць на ваеннай кафедры студэнты ўніверсітэта, неабходны ім, каб стаць сапраўднымі абаронцамі Радзімы, стойкімі і кемлівымі (фота злева).

А дзяўчаты ў гэты час вывучаюць фізіялогію, хірургію, асаблівасці догляду за хворымі. Іх другая спецыяльнасць — медыцынская сястра. На здымку вы бачыце М. С. Бабровіча, выкладчыка анатоміі і фізіялогіі, са студэнтамі ў анатамічным музеі.

Фота С. Дзеянкова і А. Дадалкі.



# НА ЖЫЦЦЁ ХОПІЦЬ

— Вячэрняя форма навучання — нешта сярэдняе паміж дзённай і завочнай,— мы гутарым з доктарам юрыдычных навук, загадчыкам кафедры дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Іосіфам Аляксандравічам Юхо. — Са стацыянара ўзяла стабільнасць у сэнсе правядзення заняткаў на працягу семестра, з завочнага — вучобу без адрыву ад вытворчасці. Думаецца, што іменна ў сувязі з апошнім вячэрняя форма навучання з'яўляецца самай цяжкай па прычыне фізіялагічных здольнасцей чалавека. Мяркуйце самі: чалавек цэлы дзень працуе, а затым, калі ўсе добрыя людзі адпачываюць, ідзе ва ўніверсітэт. Цяжка, вядома. Студэнтам вячэрняга аддзялення даводзіцца ганяцца за двума зайцамі: і на рабоце паспець, і ў вучобе не адстаць. Для некаторых з іх і работа, і вучоба аднолькава важныя. Такія прыходзяць у ВНУ за ведамі. Для іншых вучоба — нешта другараднае. Такія маюць даволі ясную мэту — дыплом.

**— Мабыць, студэнты дзённага аддзялення атрымліваюць у сілу свайго становішча большую колькасць ведаў, г. зн. тэарэтычна падрыхтоўваюцца яны лепш, чым вячэрнікі. Але апошнія, можна сказаць, штодзённа практыкуюцца. Ці не ўраўнаважвае гэта іх становішча?**

— Наогул, так. Але не буду гаварыць пра другіх, скажу пра «сябе». Спецыфіка юрыдычных прафесій у тым і заключаецца, што ўсе яны, ці амаль усе, патрабуюць вышэйшай адукацыі. З гэтага вынікае, што навучэнцы нашага факультэта маюць вельмі пакуль што няясныя ўяўленні аб сваіх будучых прафесіях. На самай справе, не будзе чалавек пракурорам або юрысконсультам, не маючы дастатковай тэарэтычнай і некаторай практычнай падрыхтоўкі. Практычных навыкаў у навучальнай установе столькі, колькі іх патрабуецца, студэнт не атрымлівае: вопыт прыходзіць ужо ў час непасрэднай працоўнай дзейнасці. Таму вельмі важна даць навучэнцу тэарэтычныя веды і навучыць яго папаўняць іх, шукаць неабходныя яму ў тым ці іншым выпадку. Як гаварыў адзін мудрэц, не той разумны, хто ўсё ведае — усё ведаць немагчыма, — а той, хто ведае, дзе і аб чым можна даведацца. Думаецца, што студэнты-вячэрнікі нашага факультэта гэта будуць ведаць.

**— З кім, на Ваш погляд, лягчэй працаваць выкладчыку?**

— Я думаю, што ўсё ж лягчэй працаваць са студэнтамі стацыянара. Тут выкладчык мае ўсе козыры ў сябе ў руках, і пры неабходнасці з некаторых студэнтаў можна спытаць з усёй строгасцю. З вячэрнікамі так нельга, тут патрэбен нейкі асаблівы падыход. Складанасць і ў тым, што людзі поўнасцю не могуць прысвяціць сябе вучобе. Гэта абавязкова трэба мець на ўвазе і ў адпаведнасці будаваць сваю педагагічную дзейнасць.

**— І ўсё ж, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, вучоба на вячэрнім аддзяленні не вычэрпваецца лекцыямі і практычнымі!**

— Так, удзел у рабоце СНТ—вось што яшчэ з аднаго боку характарызуе вячэрнікаў. Хочацца дадаць: не толькі ўдзел, але і значныя поспехі. Самы свежы прыклад: студэнт VI курса Якаўлеў, які працуе юрысконсультам, у гэтым годзе пісаў навуковую працу «Прававыя і палітычныя погляды А. Т. Касцюшкі». Яна трапіла на ўсесаюзны конкурс, дзе атрымала даволі высокую ацэнку. Работа выканана на добрым прафесійным узроўні, арыгінальная. Вось вам і ўменне браць веды, вось вам і тэарэтычная падрыхтоўка.

**— Значыць, рэзкай якаснай мяжы паміж вячэрняй і дзённай формай навучання не існуе!**

—Я з вамі згодзен. І дабаўлю яшчэ: на вячэрняе аддзяленне галоўным чынам ідуць людзі, якія прагнуць паўсядзённай дзейнасці, людзі, якія прывыклі аддаваць сябе без астатку, не менш таленавітыя або разумныя, чым студэнты стацыянара. Яскравы прыклад — вучоба студэнта III курса вячэрняга аддзялення нашага факультэта Мікалая Пракоф'ева. Ён працуе станочнікам на заводзе аўтаматычных ліній і вучыцца. Але як працуе хлопец! Як ён вучыцца! Вы ведаеце, што такое кожны дзень стаяць дзве вахты? А ён стаіць. Вось такія, як Коля, прыходзяць за ведамі, і яны іх атрымліваюць.

**— Многа!**

— На жыццё хопіць.

**М. КАЗЕЙКА.**

# СПЫНІЦЬ ІМГНЕННЕ

Наша захапленне — паляванне, але не з ружжом. А двойчы дасканалае — і у тэхнічных, і у гуманных адносінах — паляванне з фотаапаратам.

З чаго усё пачалося? Мабыць, з захаплення кнігамі выдатных фатографау-натуралістау Э. Галаванавай і Ю. Пукінскага, галоуным чынам іх цудоунымі фотаздымкамі, якія захоуваюць непаўторныя моманты з жыцця птушак. Дзякуючы гэтым фотаздымкам мы убачылі, якіх казачных птушак утойвае ад нас лес, як шматаблічна іх жыццё.

І нам хацелася самім убачыць птушак у надзвычайным асвятленні, сваімі рукамі спыніць цудоуныя імгненні.

Першыя вынікі былі, мякка кажучы, сціплымі, здымкі не заусёды атрымліваліся. Адбівалася часам няведанне звычак той або іншай птушкі. Для здымак мы спрабавалі выкарыстоуваць розныя спосабы фотапалявання, у прыватнасці паляванне з прыкрыцця. Мы знаходзілі гняздо, будавалі на адлегласці будан, каб можна было непрыкметна назіраць за жыццём птушынай сям'і.

Часта у сасновым бары можна пачуць своеасаблівы гук: «раак-раак». Гэта пяе сіваграк, або, як яго яшчэ называюць, сіваваронка.

Паглядзіце, адкуль даносіцца гук, і вы убачыце птушку на сухой галінцы дрэва. Падыдзіце бліжэй — і зможаце назіраць моцны, хуткі яе палёт, убачыце, як блісне на сонцы ярка-сіняе апярэнне.

Сіваграк — дастаткова асцярожная птушка. Гняздо яе нам удалося знайсці у лясах пад Плешчаніцамі. Месца «выдала» нам птушаня сіваграка, крык якога быу чутны здалёку. Гняздо знаходзілася у дупле сасны.

Мы збудавалі на зямлі каля дрэва будан, умацавалі фотаапарат і сталі чакаць. Праз некаторы час паказалася птушаня. Усеушыся на край дупла і глянуушы у наш бок, яно зноу прынялося крычаць. Мы сфатаграфавалі яго і пачалі чакаць дарослага сіваграка. Было шмат камароу, рукі і ногі анямелі. Нарэшце, у квадраціку відашукальніка з'явілася птушка і, не даушы нам магчымасці захаваць яе на фотаплёнцы, знікла. Такое паутаралася многа разоу. Відавочна, птушка адчувала нашу прысутнасць, ды і бляск аб'ектыва выдавау, таму не хацела доуга затрымлівацца ля гнязда. Тым не менш шэраг здымкау зрабіць удалося. Зрэшты, мяркуйце самі.

**А. КАЗУЛІН,**
**Б. ЯМІНСКІ,**
**студэнты II курса біяфака.**





# АГЛЯД ТВОРЧЫХ СІЛ

Падведзены вынікі універсітэцкага агляду агітацыйна - мастацкіх брыгад усіх факультэтау, які прахадзіу у канцы снежня. Журы вырашыла першае месца не прысуджаць. Другое месца падзялілі агітбрыгады ФПМ і фізічнага факультэта. Трэцяе занялі гісторыкі. Сярод студэнцкіх агіттэатрау лепшым быу прызнан СТМ факультэта журналістыкі.

Вельмі шкада, што хімікі, географы, юрысты так і не прынялі удзел у конкурсе.

А г і т к а л ектывы ФПМ, фізфака і журфака узнагароджаны турысцкімі пуцёукамі і паедуць у горад Брэст.

На пасяджэнні журы было адзначана, што многія дэканаты, камсамольскія арганізацыі праявілі вялікі клопат, ініцыятыву у арганізацыі і функцыяніраванні факультэцкіх агіткалектывау. Але у далейшым неабходна звярнуць больш увагі на удасканаленне мастацкага вырашэння выбраных тэм, на іх глыбокае асэнсаванне.

**Наш кар.**

ПА МУЗЕЯХ, ВЫСТАЎКАХ СТАЛІЦЫ

# НАВЕДАЛА БЕЛАРУСЬ

У Мінскім Палацы мастацтвау была арганізавана самая прадстаунічая выстаука эстампа. У яе экспазіцыі — больш тысячы творау 376 аутарау усіх саюзных рэспублік.

Праца і поспехі народу, выдатнае адлюстраванне ваенных будняу, філасофскі роздум над пытаннямі жыцця— такая тэматыка выстаукі.

Непаўторныя і багатыя навізной творы кожнага аутара, і разам з тым адчуваецца захаванне у іх інтэрнацыянальнага адзінства культуры, якая увасобіла рысы нашага часу.

Папулярнасцю карыстаюцца творы В. Мельнічэнкі і Е. Харкова, цалкам прысвечаныя падзеям у Чылі. Зауважце, гэта своеасаблівы пратэст мастацтва эстампа супраць злачынства ваеннай хунты.

Прыемна, што на выстауцы былі дастаткова шырока прадстаулены творы майстроу беларускага эстампа. Не засталіся гледачы раунадушнымі да серый творау «Традыцыі «Растсельмаша» А. Каробскага, «Трактарны завод» М. Моучана.

Своеасабліва стварыу А. Кашкурэвіч карціну «Партызанскія маці», якая увайшла у яго серыю «Партызаны». Дакладна і таленавіта адлюстравау аутар складаны, але цалкам адпавядаючы рэчаіснасці вобраз беларускай жанчыны, маці-партызанкі.

Увогуле экспанаты выстаукі эстампа сцвярджаюць невычэрпныя магчымасці гэтага віду графікі.

**А. КАЗАЧОНАК,**
**студэнт.**

# ПОБАЧ З НАМІ—ЧЭМПІЁН

Нядауна студэнт II курса факультэта журналістыкі, кандыдат у майстры спорту Сяргей Крапівін стау пераможцам адкрытага першынства па стральбе рэспубліканскай спартыуна-тэхнічнай школы ДТСААФ. Наш карэспандэнт узяу інтэрв'ю у чэмпіёна.

**— Сяргей, як пачаўся твой шлях у вялікі спорт?**

— Яшчэ школьнікам захапіуся стральбой. Рагатка, лук, вінтоука — вось такі быу пачатак... Ну, а потым ужо заваявау званне чэмпіёна, быу прызёрам спартакіяд школьнікаў БССР, рэкардсменам у камандным заліку, чэмпіёнам Мінскай вобласці.

**— Існуе думка, што стральба — справа наогул простая, асаблівага ўмення не патрабуе. Узяў вінтоўку — і страляй. А што ты скажаш?**

— Гэтая думка у корані няправільная. Дастаткова успомніць хоць бы практыкаванне «Вялікі стандарт», якое прадаужаецца на спаборніцтвах па пяць гадзін. З трох становішчау неабходна зрабіць сто дваццаць заліковых выстралау. Пры выкананні гэтага практыкавання спартсмены трацяць па 3 — 4 кілаграмы вагі. Гэта можна параўнаць толькі з марафонскім бегам.

Ёсць у стралковым спорце і іншыя цяжкасці, напрыклад, псіхічныя нагрузкі. Калі, дапусцім, веласіпедыст, абагнаушы каго-небудзь, радуецца, натхняецца, то гэтае узбуджэнне ідзе на карысць, дае яму новыя сілы. У стральбе—наадварот. Успышка радасці, якая выклікана поспехам на нейкім этапе, можа парушыць псіхічную раунавагу, дэзарганізаваць спартсмена, што адразу адбіваецца на выніках. Вытрымка і яшчэ раз вытрымка — гэта адна з галоўных нашых запаведзей.

**— Гавораць, стралку неабходна мець выключна востры зрок і цвёрдую руку. Якім жа ты бачыш спартсмена-стралка?**



— Зрок у мяне самы звычайны, а многія майстры стральбы нават носяць акуляры. Што датычыць «цвёрдай рукі», то тэхніка валодання зброяй прыходзіць з часам.

Мая ж асабістая думка па гэтаму пытанню такая: стралок павінен умець канцэнтрыраваць у патрэбны момант свае валявыя намаганні, быць устойлівым у адносінах да знешніх раздражняльнікау. Аднак зусім не трэба быць звышчалавекам. Нормы стралковага спорту падыходзяць да усіх. І я звяртаюся да юнакоў і дзяўчат, якія жадаюць займацца стральбой: прыходзьце, спорт чакае вас.

**Д. ВАЛОДЗІН,**
**студэнт журфака.**
Фота **В. Матусевіча.**

# У ЧАС АДПАЧЫНКУ

— СЁННЯ у нас госці: Рамуальд Клім, неаднаразовы рэкардсмен свету па кіданню молата, і Дзіяна Ніканчыкава, ганаровы майстар спорту СССР па фехтаванню,—гэтымі словамі вядучы адкрыу спартыуны вечар на гістфаку.

Ля трыбуны — Рамуальд Клім, цяпер трэнер. Займаецца з моладдзю і можа ганарыцца яе дасягненнямі: Аляксандр Яфімау, напрыклад, устанавіу рэкорд БССР па штурханню ядра.

Ёсць што успомніць і са сваёй спартыўнай біяграфіі: 18 разоў выступаў на першынстве СССР, прывёз золата з Алімпійскіх гульняў у Токіо і са спаборніцтваў, што праводзіліся у Будапешце, быў сярэбраным прызёрам на Алімпійскіх гульнях у Мехіка і спаборніцтвах у Афінах, чатыры разы адстойваў званне мацнейшага у Саюзе і два разы перамагаў на спартакіядах народаў СССР.

— Барацьба у час спаборніцтваў драматычная, — гаворыць Р. Клім. — Маім галоуным супернікам быу М. Жывоцкі (Венгрыя). З ім прыйшлося змагацца у Токіо, дзе усё-такі перамог я. А вось у Мехіка мне давялося спусціцца на прыступку ніжэй, уступаючы вышыню венгерскім сябрам.

— Цяпер я трэнер, — прадаўжае Р. Клім, — гэта другое спартыўнае жыццё.

— Цікава, аб якім спаборніцтве у Вас самае моцнае уражанне? — гэта пытанне Дзіяне Ніканчыкавай.

— Помніцца да драбніц першынство свету 1961 г. у Італіі. Напэуна таму, што я упершыню прывезла адтуль залаты медаль.

— Як вядома, Вы таксама перайшлі на трэнерскую работу. Ці задаволены Вы сваімі вучнямі?

— Калі я у 1968 годзе набрала групу дзяўчынак, сярод іх была і Таццяна Дронь, цяпер студэнтка вашага факультэта. У гэтым годзе яна удзельнічае ва Усесаюзных маладзёжных спаборніцтвах.

— Перспектывы беларускага фехтавання?

— З 1961 г. наша беларуская каманда на міжнародныя спаборніцтвы прадстауляла, як мінімум, пяць чалавек. Але цяпер старая гвардыя сышла, а маладыя не падраслі. Але ёсць упэуненасць, што беларускія фехтавальшчыкі зоймуць ранейшыя пазіцыі. Наш Аляксандр Раманькоу у гэтым годзе першым з беларускіх фехтавальшчыкаў стау чэмпіёнам Савецкага Саюза. Падаюць надзеі Лена Бялова, Віктар Сідзяк, Ірына Бокун.

...Вечар у разгары. Р. Клім віншуе лепшых спартсменаў факультэта, уручае граматы, падарункі.

Паказальныя выступленні хлопчыкаў і дзяўчынак з рэспубліканскай спартыўнай школы-інтэрната, якіх трэніруе Дзіяна Ніканчыкава, Наталлі Хвастовай, майстра спорту па спартыўнай гімнастыцы, самбістаў упрыгожылі спартыўнае свята.

**В. ВАРАБЕЙ.**



**Знаёмцеся: вось які я; пяшчота; пазнанне жыцця.** **Фота У. БУДАЯ.**

# Дыялогі

— Наш дэкан вельмі добразычлівы чалавек.

— Чаму ты так думаеш?

— Ён выклікау мяне і сказау: «Я не уяўляю сабе, як змагу абыходзіцца без вас, але з новага года паспрабую...»

***

Прафесар псіхалогіі:

— Мы дайшлі да паняцця «хлусня». Аб гэтым пытанні я ужо пісау у сваёй навуковай працы «Аб хлусні». Падыміце рукі, хто чытау гэтую кнігу?

Усе студэнты, як адзін, паднялі рукі.

— Выдатна! — працягвау прафесар. — Вось мы маем цудоўны прыклад для лекцыі. Мая кніга яшчэ не выйшла з друку.

**Рэдактар**
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. АТ 05017 Заказ № 29